№ 197 (319)
Серада, 5 лістапада 1997 г.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

Intec Computer
Газета сверстана на компьютерах фирмы "ЛИНТЕК"

BelPaper
Крупнейший поставщик бумаги и картона от шведских и финских производителей на Беларуси.
Тел. (017) 223-28-33.

Сонца

	Усход	Захад
Віцебск	7.11	16.18
Магілёў	7.06	16.20
Гомель	6.59	16.21
Мінск	7.17	16.33
Гродна	7.31	16.46
Брэст	7.27	16.51

Першая квадра 7 лістапада

Пейджинговую связь редакции обеспечивает компания ЛОБИЛКОМ пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

Кальченко & К
ЛАМПЫ КАБЕЛЬ СВЕТИЛЬНИКИ ПРОЖЕКТОРЫ ЭЛЕКТРООБОРУДОВАНИЕ 8-(017)-213-70-13

Ліст галоўнага рэдактара

"Народная воля" не прэтэндуе на ролю суперапазіцыйнай газеты...

Шаноўныя прыхільнікі "Народнай волі"!

Не люблю каменціраваць афіцыйных асоб. Не мой гэта хлеб. Але... Я вымушаны адклікнуцца на словы, сказаныя прэзідэнтам А.Р.Лукашэнкам падчас нядаўняй сустрэчы з дэлегацыяй Міжнароднай канферэнцыі журналістаў краін СНД і Балтыі. Маю на ўвазе не яго прылюднае і, як некаторым паказалася, катэгарычнае даручэнне І.Пашкевічу: ну выкліч, выкліч ты Сярэдзіча і вырашце нарэшце пытанне, каб "Народная воля" друкавалася ў Мінску.

Тая шырока разрэкламаваная сустрэча адбылася ў мінулую серуду, і я чакаў, што ўжо ў той жа дзень мне скажуць: "З наступнага нумара "Народная воля" будзе друкавацца там, дзе друкуецца "Советская Белоруссия". Але... Ні ў серуду, ні ў чацвер, ні ў пятніцу, ні ў выхадныя ніхто з адпаведнага начальства пра даручэнне прэзідэнта не нагадаў. На выходзе ўжо і панядзелак, праз гадзіну-другую плёнкі палос павязуць за мяжу, каб там, у Вільнюсе, як гэта ўжо робіцца на працягу амаль двух гадоў, загадзя адрукаваць тыраж.

І ўсё ж не пра гэта я хачу сёння павесці гаворку. Лічу неабходным спыніцца на характарыстыках, дадзеных прэзідэнтам асобным выданням. У першую чаргу — незалежным. Па словах Лукашэнкі, газета "Свабода" — **супержелтая**, а "Народная воля" — **суперопозиционная**.

"Народня воля" ніколі не прэтэндавала і не прэтэндуе на ролю суперапазіцыйнай газеты. Хоць, упэўнены, такая газета ў краіне павінна быць. А калі, па меркаваннях Аляксандра Рыгоравіча, яна і сапраўды суперапазіцыйная, то такой яна стала дзякуючы яму.

Колькі на Беларусі радыёкропак? Лік ідзе калі не на мільёны, дык блізка да гэтага. А чый голас, які пазнаюць ужо нават грудныя дзеці, даносіцца з шасці гадзін ранку да дванаццаці ночы з насценных і настольных рэпрадуктараў? Канечне ж, Аляксандра Рыгоравіча. Ну яшчэ дзесятак-другі чыноўнікаў заўважаны ў чарзе перад мікрафонамі.

Хто больш за ўсіх цікуе за намі з каляровых і чорна-белых тэлеэкранаў? Правільна — той жа чалавек, чый няспынны голас адначасова гучыць і з усіх "мацюгальнікаў" — такім нядобрым словам ахрысцілі ў народзе тыя ж рэпрадуктары. Вядома, мільгаюць і сыценькія твары яго адданых "вертыкальшчыкаў". Не адмаўляецца ў эфіры і некаторым навукоўцам з гістарычным ухілам, якім лягчэй прадаць маці родную, чым сказаць людзям праўду.

А пагартайце старонкі "Советской Белоруссии", "Народнай газеты", "Белорусской нивы", "Рэспублікі", "Звязды"... Хто галоўны герой першапалосных публікацый? Хто аўтар не толькі агучаных па некалькі разоў, але і надрукаваных ва ўсіх вышэйпералічаных газетах прамоў, зваротаў, заклікаў? Так, так...

А дзе ж апазіцыя, якую сам Аляксандр Рыгоравіч, па яго словах, гатовы на руках насіць? Чаму ў прамым эфіры (ды і не толькі ў прамым) таго ж Беларускага радыё даўным-даўно не чуваць голасу старшыні апальнага Вярхоўнага Савета 13-га склікання Сямёна Шарэцкага? Я не магу ўспомніць, калі апошні раз выступаў перад радыёмікрафонам і камуніст-апазіцыянер Васіль Новікаў. Калі і правроцца ў эфір нейкае яго слова, то намеснік спікера сам не разумее: гэта ён гаварыў ці нехта іншы? Мантаж плёнкі робіцца такім чынам, каб не столькі даць чалавеку выказаць сваю думку, колькі з дапамогай заангажыраванага каментарыя перавярнуць усё з ног на галаву.

Беларускае радыё, як вядома, атрымоўвае значныя сродкі з дзяржаўнай казны, а калі быць больш дакладным — то з кішэні падаткаплацельшчыкаў. А імі з'яўляюцца не толькі Уладзімір Замяталін, Іван Пашкевіч, Рыгор Кісель, але і Васіль Шлындзікаў, Юрый Хадыка, Станіслаў Гусак, Сяргей Калякін... Дык чаму доступ да мікрафонаў адным забяспечаны, а другія гэтага пазбаўлены. Тры-чатыры гады назад такія актыўныя апаненты Лукашэнкі, як Генадзь Карпенка, Валянцін Голубеў, Юрась Беленькі, Алег Трусаў і многія іншыя маглі хоць зрэдку, але звярнуцца па радыё да грамадскасці, а цяпер жа, кажуць, іх і блізка не падпускаюць да радыёстудый. Апазіцыянераў-парламентарыяў, апазіцыянераў-бізнэсфаўцаў можна пачуць толькі на мітынгах, якія часта заканчваюцца пабоішчамі, з перамогай людзей у камуфляжнай форме.

На Беларускім тэлебачанні ўся апазіцыя заменена каментатарам з бліскаючымі вачыма і яго вернымі сяброўкамі. Некалі Віктар Ганчар блізка сябраваў амаль з усімі галоўнымі рэдактарамі дзяржаўных газет. Сёння яны стараюцца не сустракацца з ім нават на бязлюдной вуліцы. Ні пры якой умове не надрукуюць востры артыкул у афіцыйнай прэсе таго ж Ганчара.

Я не адкрыю Амерыкі, калі скажу, што на Беларусі цяпер дзейнічае нікім не пісаны закон: да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі апазіцыю падпускаюць не бліжэй, чым на адлегласць гарматнага выстралу. Прычына вядомая. Віктар Ганчар нядаўна заявіў: "Для таго чтобы "просветить", например, какой вред нанесли стране Лукашенко и его "поплечники", потребуется три телевизионные передачи. И у людей откроются глаза, и притом очень широко. Нынешняя власть это знает, и потому мертвой хваткой держит в руках телевидение, и его нам никогда не отдадут..."

Вось так — той, хто прыйшоў да ўлады і захапіў тэле- і радыёэфір, старонкі масавых газет, можа зрабіць сляпымі і глухімі не сто і нават не тысячу чалавек, а ўвесь народ. Ці ж можна з гэтым пагадзіцца? Рэакцыя на такую палітыку ўлад — адпаведная пазіцыя недзяржаўнага друку, незалежных радыё- і тэлеканалаў. З апошнімі на Беларусі, здаецца, ужо расправіліся. "Радыё-101,2" спынілі яшчэ больш за год назад, а з тэлеканалаў засталіся толькі тыя, якія гадзінамі круцяць сурагатныя баевікі і іншае кінасмецце, перамяжаючы з рэкламай розных жвачак і шампуняў.

Але вернемся, шаноўны чытач, да галоўнай тэмы размовы — чаму "Народная воля", па словах прэзідэнта, стала **суперопозиционной**.

Што параіце рабіць галоўнаму рэдактару, калі ў рэдакцыю заходзяць Сямён Шарэцкі, Васіль Новікаў, Генадзь Карпенка, Валянцін Голубеў, Юрась Беленькі, Алег Трусаў і многія іншыя маглі хоць зрэдку, але звярнуцца па радыё да грамадскасці, а цяпер жа, кажуць, іх і блізка не падпускаюць да радыёстудый. Апазіцыянераў-парламентарыяў, апазіцыянераў-бізнэсфаўцаў можна пачуць толькі на мітынгах, якія часта заканчваюцца пабоішчамі, з перамогай людзей у камуфляжнай форме.

На Беларускім тэлебачанні ўся апазіцыя заменена каментатарам з бліскаючымі вачыма і яго вернымі сяброўкамі. Некалі Віктар Ганчар блізка сябраваў амаль з усімі галоўнымі рэдактарамі дзяржаўных газет. Сёння яны стараюцца не сустракацца з ім нават на бязлюдной вуліцы. Ні пры якой умове не надрукуюць востры артыкул у афіцыйнай прэсе таго ж Ганчара.

Я не адкрыю Амерыкі, калі скажу, што на Беларусі цяпер дзейнічае нікім не пісаны закон: да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі апазіцыю падпускаюць не бліжэй, чым на адлегласць гарматнага выстралу. Прычына вядомая. Віктар Ганчар нядаўна заявіў: "Для таго чтобы "просветить", например, какой вред нанесли стране Лукашенко и его "поплечники", потребуется три телевизионные передачи. И у людей откроются глаза, и притом очень широко. Нынешняя власть это знает, и потому мертвой хваткой держит в руках телевидение, и его нам никогда не отдадут..."

Вось так — той, хто прыйшоў да ўлады і захапіў тэле- і радыёэфір, старонкі масавых газет, можа зрабіць сляпымі і глухімі не сто і нават не тысячу чалавек, а ўвесь народ. Ці ж можна з гэтым пагадзіцца? Рэакцыя на такую палітыку ўлад — адпаведная пазіцыя недзяржаўнага друку, незалежных радыё- і тэлеканалаў. З апошнімі на Беларусі, здаецца, ужо расправіліся. "Радыё-101,2" спынілі яшчэ больш за год назад, а з тэлеканалаў засталіся толькі тыя, якія гадзінамі круцяць сурагатныя баевікі і іншае кінасмецце, перамяжаючы з рэкламай розных жвачак і шампуняў.

Але вернемся, шаноўны чытач, да галоўнай тэмы размовы — чаму "Народная воля", па словах прэзідэнта, стала **суперопозиционной**.

Што параіце рабіць галоўнаму рэдактару, калі ў рэдакцыю заходзяць Сямён Шарэцкі, Васіль Новікаў, Генадзь Карпенка, Уладзімір Нісцюк, Анатоль Лябедзька, Васіль Шлындзікаў, Аляксандр Бухвостаў і іншыя іх калегі па Вярхоўнаму Савету 13-га склікання? Што рабіць галоўнаму рэдактару з лістамі, якія перыядычна дасылаюць у рэдакцыю Сяргей Навумчык і Зянон Пазняк? Што рабіць з простымі людзьмі, якіх улада пакрыўдзіла, адкінула, растаптала і якія хочуць сказаць сваё слова? Я дзейнічаю так, як падказвае маё сэрца і сумленне грамадзяніна Беларусі.

Адчыніце, Аляксандр Рыгоравіч, дзверы радыё і тэлебачання, вашых газет для апазіцыі і не толькі для яе... Запэўніваю Вас: як толькі Вы гэта зробіце, адразу зменіцца аблічча друку, які, паруску кажучы, Вы называеце **супержелтым или суперопозиционным**.

Я ўжо неяк пісаў, што ўсе мы жывём на адной зямлі — і тыя хто з бел-чырвона-белым сцягам звязае нацыянальнае адраджэнне Бацькаўшчыны, яе заўтрашні дзень, і тыя, хто дзесяткі гадоў будаваў і працягвае будаваць "светлае будучае" і хто гатовы верыць у гэты міф да апошніх дзён свайго жыцця. Паразуменне паміж людзьмі, збліжэнне іх на аснове агульначалавечых каштоўнасцей у многім залежаць ад стаўлення ўлады да свабоды слова, да дэмакратызацыі прэсы ў цэлым. Няма, Аляксандр Рыгоравіч, у амерыканскага прэзідэнта Біла Клінтана сваёй газеты, радыё і тэлебачання, адмоўцеся і Вы ад нястрымнага жадання кіраваць прэсай. Калі далёка ад нас Амерыка, то па суседзяў — Польшча, Літва, Германія... Усюды і тыя, хто пры ўладзе, і тыя, хто ў апазіцыі да яе, маюць аднолькавае права на свабоду слова.

На Беларусі, на жаль, дзейнічаюць іншыя законы. Гэта і прыводзіць да таго, што "Народная воля" здаецца Вам, Аляксандр Рыгоравіч, **суперопозиционной**. Я ж яе бачу нармальным выданнем, якое паважае сваіх чытачоў.

Іосіф СЯРЭДЗІЧ,
заснавальнік
і галоўны рэдактар газеты "Народная воля".

Трагедыі

Депутат Викентий Козловский покончил жизнь самоубийством...

Валерий ЩУКИН,
депутат Верховного Совета 13-го созыва

2 ноября 1997 года родственники и земляки провожали в последний путь Викентия Антоновича Козловского — заместителя председателя Комиссии Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва по аграрным вопросам и социальному развитию села, депутата от Смолевичского избирательного округа №210.

В Смолевичском районе Викентия Антоновича знают, считай, все. Три десятка лет он тут жил и работал. Двадцать лет подряд в качестве председателя тянул на себе колхоз имени Ф.Дзержинского, где создал крупный тепличный комплекс. Еще десяток председательских лет отдал колхозу имени Ленина. При нем оба хозяйства строили дома, развивали производство, добивались хороших показателей.

Земляки отмерили ему по заслугам, когда дружно выбрали В.А.Козловского депутатом высшего представительного органа республики. В Верховном Совете 13-го созыва Викентий Антонович, кандидат экономических наук, работал на постоянной основе заместителем председателя одной из важнейших для Беларуси парламентских комиссий, отдавая все свои знания и опыт подготовке законопроектов.

В период политического кризиса осени 1996 года В.А.Козловский поставил свою подпись под обращением депутатов в Конституционный суд с просьбой дать юридическую оценку действиям А.Лукашенко, которая впоследствии предоставила бы возможность для начала процедуры импичмента президента. Впоследствии, как и некоторые другие коллеги по парламенту, отозвал свою подпись. Известно, что сделал он это после личной беседы наедине с земляком и президентским эмиссаром Сергем Лингом, нынешним главой правительства. Тогда многих депутатов примерно таким вот образом "сломали"... Импичмент не состоялся. Позже смолевичский депутат-аграрий написал заявление о желании работать в Палате представителей, но принят туда не был. В конечном итоге оказался в числе тех 88 депутатов Верховного Совета 13-го созыва, которых президент изгнал из парламента.

Возвратившемуся в район Викентию Антоновичу не удалось, по вполне понятным причинам, вернуться на прежнюю работу председателем колхоза им.Ленина. Депутат Козловский, как и другие его коллеги, по сути, оказался на положении бесправного безработного. В глубинке, в деревне Батуринка, он оставался один на один со своими мыслями. На селе ведь, как известно, не очень-то жалуют несогласных с президентом, а минские политические баталии развивались вдали от "затворника".

В семье Викентия Антоновича в общем-то все было благополучно. Обе дочери замужем, жильем обеспечены. Сам он на берегу здешнего водохранилища имел дом, в котором вместе с женой мог досматривать престарелую мать и обеспечивать отдых четырем внукам. Если бы он доработал, как предусмотрено Конституцией 1994 года, весь свой депутатский срок в Овальном зале, то как раз к 2000 году ему исполнилось бы 60 лет. Можно было бы уходить на пенсию и жить себе поживать.

К 58 годам у депутата Викентия Антоновича Козловского не было ни работы, ни пенсии, ни покоя в душе. Лишь усугублялись сомнения в правильности своих поступков и чувство личной ответственности за безрадостную перспективу белорусского народа. Тягостное свое внутреннее состояние он не скрывал от близких людей.

Что человеку оставалось? Идти поднимать другое хозяйство? На новом месте отстраивать дом для семьи? Чтобы все начать с нуля, сил и времени не хватало, все-таки возраст. Вовсе уехать? А детей и внуков разве оставишь?

...На похоронах люди говорили, что окончательно надломила Викентия Антоновича известие о расправе над знаменитым хозяйственником Василием Старовойтовым. Вечером 31 октября 1997 года он пошел в сарай, из петли его вынули уже мертвым...

Хоронить депутата и известного в районе человека прибыли руководители здешних хозяйств. Кавалькада автомашин была не менее длинной, чем на похоронах тоже депутата Евгения Миколуцкого. Но если в Могилеве государственного деятеля провожали в последний путь с помпой, то в Смолевичах для покойного Викентия Козловского — тоже государственного деятеля — не нашлось даже захудалого похоронного оркестра. На погребение коллеги не явились депутаты Палаты представителей, на "скамейке запасных" у которых числился депутат В.А.Козловский. Президентские депутаты, "штурмом" бравшие места в автобусах, чтобы отметиться в Могилеве на похоронах президентского друга, на сей раз попрятались по норам, лишь бы не "засветиться" в Смолевичах...

Проводить коллегу в последний путь прибыли заместитель председателя Верховного Совета 13-го созыва Геннадий Карпенко, председатель Комиссии по аграрным вопросам и социальному развитию села Геннадий Усюкевич, заместитель председателя Комиссии по проблемам чернобыльской катастрофы Михаил Грушевский.

Довелось видеть похороны Миколуцкого и Козловского автору этих строк — секретарю Комиссии по национальной безопасности, обороне и борьбе с преступностью.

Похоронили депутата на кладбище, которое находится на землях колхоза имени Ф.Дзержинского.

Кладбище расположено совсем рядом с курганом Славы — от могилы до мемориала только московское шоссе пересечь...

Слышали?

Белорусские либералы посетили Ирак

Завершился официальный визит делегации Либерально-демократической партии во главе с председателем ЛДП Сергеем Гайдукевичем в Республику Ирак.

В ходе визита партийная делегация ознакомилась с внутриполитической обстановкой в стране, провела переговоры с руководством партий БААС и имела ряд официальных встреч с руководством Республики Ирак.

Итогом визита стало подписание Договора о сотрудничестве между Партией арабского социалистического возрождения и Либерально-демократической партией.

Валентина МАЗУР.

Акцыя

Прэмія для артыстаў балета. Ад "Філіп Морыс"

На святочнай вечарыне, прысвечанай юбілею Валянціна Елізар'ева, што нядаўна адбылася ў Нацыянальным акадэмічным тэатры балета, прадстаўніцтва кампаніі "Філіп Морыс" на Беларусі аб'явіла аб заснаванні ў рэспубліцы спецыяльнага прыза ў мэтах падтрымкі артыстаў балета і заахвочвання іх творчага роста "Лепшая роля сезона". Узнагарода — спецыяльны прыз і грашовая прэмія — будуць уручаны лаўрэату ў пачатку студзеня наступнага года на адпаведнай цырымоніі ў Нацыянальным акадэмічным тэатры балета. Як запэўнілі арганізатары акцыі, пры выбары лаўрэата будзе ўлічвацца мастацкі ўзровень успрымання, акцёрскае майстэрства, балетная тэхніка, а таксама вобразнае ажыццяўленне ролі.

Дарэчы, прэмія "Філіп Морыс" за лепшае выступленне ў балетным спектаклі была заснаваная ў 1977 годзе ў Фінляндыі і з тых часоў яна штогод уручаецца амаль ва ўсіх краінах свету.

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

Выставы

"Яны стваралі музей",

ці "100 рарытэтаў з калекцый Нацыянальнага музея Беларусі"

Сёлета Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі адзначае важныя даты сваёй гісторыі — 40-годдзе пачатку дзейнасці арганізацыйнай групы па стварэнні Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея і 30-годдзе з дня адкрыцця першай пасляваеннай экспазіцыі, якая пасля цяжару польска-савецкай і Вялікай Айчыннай войнаў адрадзіла нацыянальны музей. Тым людзям, што стаялі ля яго вытокаў і тым, што працуюць тут зараз, адданым сваёй справе прысвечана выстава "Яны стваралі музей".

Сёння Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі — гэта найбуйнейшае сховішча нацыянальных рэліквій, скарбніца матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа. З нагоды юбілею ў музеі пачала працаваць і выстава "100 рарытэтаў з калекцый Нацыянальнага музея Беларусі", экспанаты якой з'яўляюцца падмуркам і музейнай калекцыі, і нацыянальнай культуры спадчыны. Па словах арганізатараў, экспазіцыя створана на аснове унікальных помнікаў найбольш значных музейных калекцый. Тут прадстаўлены каштоўныя ўпрыгожванні са старажытных курганоў, манетныя скарбы, іконы, кнігі, заходнееўрапейскі фарфор, беларускае мастацкае цыклo і нават скрыпкі італьянскіх майстроў 16—18 стагоддзяў.

Дарэчы, абедзве выставы будуць працаваць да 14 снежня.

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

Дзяды

Без правакацый не абышлося

Ушанаванне памяці продкаў, на жаль, не абышлося без правакацый. Першая з іх адбылася пры ўскладанні кветак каля будынка КДБ. Як паведамілі на прэс-канферэнцыі ў штаб-кватэры Беларускага народнага фронту, быў дазвол на ўскладанне там кветак невялічкай дэлегацыяй з пяці чалавек. Пяцёра і рушылі туды. Па дарозе да іх далучыліся многія з тых, хто прымаў удзел у пікеце на вуліцы Няміга. У выніку адзін з арганізатараў ускладання кветак быў дастаўлены ў аддзяленне міліцыі, дзе зроблены адпаведны запіс. Кіраўнікі БНФ выказалі апасенне, што яму можа быць прыпісана арганізацыя несанкцыянаванага шэсця і ўзбуджана супраць яго крымінальная справа.

Там жа трое міліцыянераў падышлі да прадстаўніка Маладога фронту Цімафея Дранчука, спрабуючы зацягнуць яго ў "варанок". Але прысутныя "адбілі" яго. І, нарэшце, у Курапатах адзін мужчына ў адказ на заўвагу накінуўся на жанчыну. Ён быў затрыманы і перададзены міліцыянерам.

Ігар КАВАЛЬЧУК.

Беларускі саюз прадпрымальнікаў прапануўвае распаўсюдзіць на недзяржаўныя навучальныя і навуковыя ўстановы парадак ільготнага падаткаабкладання

Беларускі саюз прадпрымальнікаў (БСП) прапануўвае распаўсюдзіць на недзяржаўныя навучальныя і навуковыя ўстановы парадак ільготнага падаткаабкладання на сродкі, атрыманыя ад гаспадарчай дзейнасці, які дзейнічае ў дачыненні да дзяржаўных устаноў гэтага профілю. Адпаведны ліст накіраваны прэм'ер-міністру Сяргею Лінгу прэзідэнтам БСП Уладзімірам Карагіным.

Як лічыць У.Карагін, распаўсюджванне на недзяржаўныя навучальныя і навуковыя ўстановы парадку ільготнага падаткаабкладання адпавядала б артыкулу 13 Канстытуцыі, які гарантуе роўныя абарону і ўмовы для развіцця ўсіх формаў уласнасці. Апрача таго, гэта дазволіла б недзяржаўным установам умацаваць матэрыяльную базу — фарміраваць бібліятэкі, набываць тэлекамунікацыйнае і вучэбнае абсталяванне, ствараць спецыялізаваныя лабараторыі, набываць вучэбныя і вытворчыя плошчы. Ільготнае падаткаабкладанне для недзяржаўных ВНУ стварыла б, на думку У.Карагіна, перадумовы для іх удзелу ў разнастайных навуковых і навучальных праграмах, з дапамогай якіх у Беларусь можна было б прыцягнуць дадатковыя матэрыяльныя сродкі, інфармацыйныя рэсурсы і забяспечыць доступ да сучасных тэхналогій.

Аляксей АРЭШКА.

Погода

5 и 6 ноября на территории республики сохранится облачная с прояснениями погода, преимущественно без осадков. Температура воздуха 5 ноября -3...+2, ночью -3...-7. 6 ноября — +2...+7, по западу 0...-5.

Страшно!

Журналисту Олегу Бебенину заломили руки и отвезли в лес...

31 октября. Пятница. Час дня. Редактору отдела новостей газеты "Имя" Олегу Бебенину катастрофически не везло. Он опаздывал на важную встречу и пытался около ГУМа поймать такси. Тщетно... Неожиданно рядом с Олегом притормозил бордовый "Фольксваген-Пассат" *(гос. номер 1128 МИ)*. Из него выбежали двое мужчин в штатском и, заломав руки ничего не понимающему Олегу, насильно запихнули его в машину...

— Ехали, — рассказывает сотрудник столичной газеты для тех, кто умеет читать, — в полной тишине. На тактичный вопрос "Куда едем?" я получил довольно-таки нелитературный ответ типа: "Потом узнаешь".

Высадили меня на опушке красивого соснового пролеска. А точнее, как выяснилось позже, на 15-м километре шоссе Минск — Заславль недалеко от Ратомки. Как ни странно, рукоприкладством мои похитители почему-то не занимались. Они всего лишь... прочли получасовую лекцию о том, как нехорошо независимым средствам массовой информации воевать с государством. Причем "лекторы" обращались не ко мне лично, а апеллировали ко всем журналистам негосударственных изданий. Через меня передали привет всем журналистам независимых средств массовой информации и пообещали, что, возможно, в ближайшем будущем постараются провести "разъяснительные беседы" подобного типа со всеми остальными. После нравоучений меня обыскали и забрали полтора миллиона белорусских рублей, 50 долларов и телефонную карточку на 60 минут...

Обратно, естественно, Олега Бебенина не отвезли. Добирался на попутках. На оставшиеся деньги, которые "похитители" по рассеянности или невнимательности не нашли.

По возвращении Олег тотчас написал заявление в Центральный РОВД. Однако его не приняли, мотивировав тем, что все заявления принимаются только по месту происшествия. Оправившись от морального потрясения, практически весь следующий день Олег провел в отделении милиции Минского района, где давал показания, описывал приметы и взывал местные органы к предельной справедливости и объективности. Олегу пообещали, что в десятидневный срок его заявление рассмотрят, а там уж окончательно решат, возбуждать ли уголовное дело. Правда, в приватной беседе сотрудники отдела милиции Минского района сказали, что не со всеми они могут бороться, дав понять, о ком идет речь.

Надо отметить, что Олег всегда активно участвовал во всех акциях, направленных против существующего режима. И можно выдвинуть такую версию: видно, у властей предержащих уже имеется черный список неугодных журналистов, которым нужно прикрыть рты. Любой ценой. Бебенин стал первым...

Марина КОКТЫШ.

Паралелі

Курапаты 1937-га. Праз шесцьдзесят год...

Пасля памінальнай суботы, калі за сямейным сталом узгадваюць свой радавод, добрым словам і з удзячнасцю памінаюць продкаў, заслужыўшых таго, каб жыць у памяці нашчадкаў, адбылася яшчэ адна не менш значная падзея.

Народны фронт Беларусі ладзіў чарговае шэсце на Курапаты.

У поўдзень на плошчы імя Якуба Коласа беларускай сталіцы сабралася каля дзвюх тысяч чалавек, якія калонай рушылі да месца захавання ахвяраў палітычных рэпрэсій трыццатых гадоў і асабліва сумнапамятнага 1937-га, з якога і вядзецца адлік лёсаў, незаслужана асуджаных "тройкамі". І хаця сёння пра Курапаты ўжо вядома ва ўсім свеце, Ваенная пракуратура Беларусі ўсё вядзе следства, то прыпыняючы яго на пэўны час, то зноў узбуджаючы ў сувязі з "новымі акалічнасцямі", якія быццам бы выяўлены ў ходзе следчых дзеянняў.

І галоўнай фігурай, якая ўчыняла пакуты і здзекі над захаванымі тут людзьмі, выступае не "сталінская машына рэпрэсій", удала запушчаная атачэннем правадыра "усіх часоў і народаў", а бравыя і бяздушныя салдаты вермахта, якія па загаду Гітлера былі гатовыя на любыя ўчынкі і дзеянні. Тое, што ў часы фашысцкай навалы існавалі масавыя расстрэлы, сумніву не выклікае. Маглі "падзахоўваць" расстрэляных, з пункту гледжання ваенных пракураў, і ў Курапатах. Але ўскрыццё брацкага могільніка пацвердзіла асноўную версію (сёння гэта ўжо неаправяржальны факт!): ахвяры захаваныя ў Курапатах задоўга да вайны.

Тым часам да калоны, якая рухалася па вуліцы Я.Коласа, Лагойскаму тракту, далучаліся сотні і сотні грамадзян. Удзельнічалі ў жалобным мітынгу ў Курапатах ужо каля чатырох-пяці тысяч мінчанаў, у большасці сваёй — маладых. Тое, што сённяшнюю моладзь хвалюе лёс іх равеснікаў, якія назаўсёды засталіся маладымі, яны не пашкадавалі сваіх жыццяў дзеля будучыні нашчадкаў — захавання заваёў дэмакратыі, правоў і свабод грамадзян.

На мітынгу выступілі намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Аляксандр Дабравольскі, намеснік старшыні сойму Народнага фронту "Адраджэнне" Лявон Баршчэўскі, іншыя аратары. І хто б не браў слова, усе абавязкова вялі гутарку пра незалежнасць Рэспублікі Беларусь, захаванне дэмакратыі ў краіне, развіццё беларускасці і г.д. Аднак наступствы на правы грамадзян, свабоду слова, якія чыняць улады, шмат у чым нагадваюць, на думку аратараў, сумнавядомы 1937-мы год. І таму барацьба канстытуцыйным шляхам за свае правы — галоўны накірунак у дзейнасці дэмакратычных сіл.

Вітольд БАРАВІЦКІ.

Памяць

Крыж "Пакутнікам Беларусі"

У аршанскіх "Курапатах", каля вёскі Андрэеўшчына, сябрамі Аршанскай і Талачынскай радаў Беларускага народнага фронту праведзена ўшанаванне ахвяраў сталінскага генацыду. Тут устаноўлены крыж "Пакутнікам Беларусі".

Алесь ЧАХОЛЬСКІ.

По-европейски?

Права человека в Беларуси изучает Международная Хельсинкская федерация

Два дня в Минске находились исполнительный директор Международной Хельсинкской федерации (МХФ) г-н Аарон Роудс и координатор МХФ по Беларуси г-н Владимир Вайсман. На пресс-конференции, состоявшейся 3 ноября с их участием, обсуждена тема "Работа Международной Хельсинкской федерации в Беларуси".

Г-н Роудс поведал о программе TACIS в Беларуси, о докладах МХФ по ситуации с правами человека в нашей стране, а также о Международной конференции **"За свободу и справедливость от Балтии до Черного моря"**, которую 5—7 декабря 1997 года проводит МХФ совместно с БХК. В работе конференции примут участие 15 бывших глав государств, а также представители зарубежных Хельсинкских комитетов.

Г-н Роудс рассказал также о деятельности Британской Хельсинкской группы, доклад которой "Беларусь: пария или жертва" опубликован в белорусских государственных газетах и вызывает противоречивые оценки.

Виктор ГОРОДЕЦ.

НЕУТОМИМЫЙ ПОМОЩНИК
КОМПЬЮТЕР NTT с монитором и комплектующими
SAMSUNG ELECTRONICS

NTT- 520
Pentium-150 Intel
RAM 8 Mb
HDD 1.2 Gb / VRAM 1 Mb
14" Samsung 3NE
FDD 3.5" / мышь/клав.
2.5 г. гарантии / 634 у.е.

NTT- 620
K6-200 MMX AMD
TX / RAM 16 Mb
HDD 2.1 Gb / VRAM 2 Mb
14"Samsung 3NE
FDD 3.5" / мышь/клав.
2.5 г. гарантии / 861 у.е.

NTT- 2703
Pentium II -300 Intel MMX / RAM 32 Mb
HDD 3.4 Gb / VRAM 2 Mb / 15"Samsung 500s
CD-ROM 24s / FDD 3.5" / мышь/клав.
2.5 г. гарантии / 2045 у.е.

NTTs (017) 229-29-99
"NEW TAIR TECHNOLOGY SYSTEMS"

Брест.....42-71-14
Барановичи.5-47-40
Витебск.....37-75-00
Гродно.....44-10-38
Жодино.....4-27-04
Гомель.....53-58-01
Могилёв.....22-69-77
Новополоцк..7-34-34
Молодечно..7-77-20
Пинск.....35-97-24

Шаноўныя прыхільнікі "Народнай волі"!

Вядзецца новая падпісная кампанія. Спадзяёмся, што і ў першай палове 1998 года мы застанёмся шчырымі сябрамі. Кошт на наша выданне захаваўся ранейшым: на 1 месяц — 29000 рублёў, на 3 месяцы — 87000, на 6 месяцаў — 174000 рублёў. Індэкс — 63222.

Вы — з "Народнай воляй"! "Народная воля" — з Вамі!

Народная Воля 5 ЛІСТАПАДА 1997 г.

Независимая экспертиза

Михаил Пастухов, доктор юридических наук, профессор

Декрет №21: Путь в 1937 год?

21 октября 1997 года президентом Республики Беларусь подписан очередной, но весьма неординарный декрет под номером 21 — "О неотложных мерах по борьбе с терроризмом и иными особо опасными насильственными преступлениями". После его прочтения остается тяжелый осадок, так как за этим декретом просматриваются зловещие последствия его реализации. Уж очень он напоминает Закон от 1 декабря 1934 года о террористических организациях и террористических актах, принятый в отместку за убийство видного партийного деятеля той поры С.Кирова. С него, собственно, и начался "великий террор", унесший, по подсчетам независимых исследователей, свыше 42 миллионов ни в чем не повинных наших сограждан (см.: "Известия". 1997, 30 октября). "Вина" последних заключалась нередко в том, что они имели неосторожность неодобрительно высказаться о "вожде всех народов" или выразить недовольство действиями властей.

Неужели через 60 лет над Беларусью вновь нависнет туча 37-го года? И снова бригады "спецов" начнут свою адскую работу по выявлению "врагов народа", на места станут доводиться задания по их количеству, а спецсуды станут послушно "выписывать" невиновным чудовищные наказания: 10, 20 лет тюрьмы без права переписки, а кому — и высшая мера наказания, т.е. расстрел.

А именно такое предчувствие складывается после изучения данного творения президентских юристов. Поверьте, оно совсем не лишено оснований!

* * *

Декрет вводит в действие "систему неотложных мер по борьбе с терроризмом и иными особо опасными насильственными преступлениями".

В чем необходимость этих "неотложных мер"? И к чему такая спешка? Объяснение находится только одно — декрет выступает ответной мерой по отношению к тем, кто может быть причастен к убийству Е.Миколуцкого. Но почему из-за нескольких убийц опасности должно подвергаться все общество? Не слишком ли дорогую цену требует президент от белорусов за совершенное преступление? А может быть, это переход к открытой борьбе со всеми недовольными режимом и развязывание *"великого террора"* в отдельно взятой постсоветской республике?

Во всяком случае, "система неотложных мер" имеет четко выраженную цель — ввести в Беларуси чрезвычайное положение со всеми его атрибутами. Свидетельством этого может служить безмерно широкое определение терроризма и его многочисленные проявления. В частности, под терроризмом в декрете понимается "применение насилия или угроз насилия в целях нарушения общественной безопасности, дестабилизации общественного порядка, устрашения населения, либо оказания воздействия на принятие решений государственными органами, либо воспрепятствования политической или иной общественной деятельности".

Вы можете назвать любое действие или высказывание, которое является неугодным для властей предержащих, и без особых сложностей их можно трансформировать в "терроризм". Например, под него могут вполне подвести угрозы, выкрикиваемые демонстрантами в адрес президента или милиции, призывы к отстранению президента от власти. Любой несанкционированный митинг, шествие, пикет можно при желании расценить как "воздействие на принятие решений государственными органами".

Еще больше расширяют сферу "террористической деятельности" формы проявления терроризма, обозначенные в подпункте 1.1 декрета. Так, террором будет признаваться совершение взрыва, поджога или иных действий, посягающих на общественную безопасность; умышленное убийство лица или его близких в связи с осуществлением им служебной деятельности или выполнением общественного долга либо совершенное способом, опасным для жизни многих людей; захват заложников; угроза или насилие по отношению к судье или народному заседателю; угроза или насилие в отношении должностного лица, работника милиции, народного дружинника, военнослужащего или иного лица в связи с выполнением им служебных обязанностей или общественного долга и т.д. На практике это может привести к тому, что если кто-то вздумает поднять руку на работника милиции, дружинника, члена оперативного молодежного отряда (которые предполагается создать для разгона демонстраций, митингов и "отлавливания" их участников), то его могут признать террористом и осудить самое малое на срок от 8 до 15 лет и обязательно с конфискацией имущества (так требует декрет. — **М.П.**).

Одна лишь угроза совершения взрыва, поджога или иных действий, создающих опасность гибели людей, причинения крупного имущественного ущерба или иных тяжких последствий в целях "нарушения общественной безопасности, устрашения населения, либо оказания воздействия на принятие решений государственными органами, либо воспрепятствования политической или иной общественной деятельности" (последнее всегда можно предполагать, но доказать практически невозможно. — **М.П.**), по декрету президента, обойдется лишением свободы на срок до 5 лет, или арестом до шести месяцев (такого наказания в Уголовном кодексе РБ до настоящего времени нет. — **М.П.**), или штрафом. А если угроза была не реальной, а мнимой? В этом случае "шутнику" можно только посочувствовать, как и тем "шутникам", которые за рассказ анекдота о власти в 30-е годы получали по нескольку лет лагерей.

Обращает на себя внимание беспрецедентное в европейской юриспруденции явление: подзаконным актом в нарушение закона и вопреки закону вводятся страшные (именно страшные, характерные для 30-х годов советской эпохи) уголовные наказания. Причем наказания, превосходящие пределы действующего уголовного законодательства: от 10 до 20 лет, пожизненное заключение, смертная казнь (!) и обязательно в сочетании с конфискацией имущества.

Поразительно, но факт: президент Беларуси единолично своим актом ввел для граждан Беларуси смертную казнь! Цивилизованная Европа отказывается от этого постыдного наказания, а президент Республики Беларусь, не имея на то оснований, вводит ее по своему усмотрению. Причем по таким составам преступлений, где люди могут быть необоснованно и даже ложно обвинены в совершении преступления.

Еще одна деталь декрета, напоминающая методы сталинского режима: граждане откровенно призываются к доносительству друг на друга. Если они "своевременно предупредят" государственные органы о готовящейся "террористической" деятельности, то подлежат освобождению от уголовной ответственности. И не только. В декрете президент предлагает Совету министров разработать закон, защищающий таких лиц наравне со свидетелями и потерпевшими. "Доброжелателей" будут специально поощрять, выделив для этого необходимые средства.

О том, что президент Республики Беларусь собирается бороться с "терроризмом" основательно и долго, свидетельствует пункт декрета о создании "специальных (!) подразделений органов внутренних дел, государственной безопасности и прокуратуры по борьбе с организованной преступностью и коррупцией". Для этих спецподразделений до 1 января 1998 года предлагается выделить отдельные здания и помещения, будет организована их подготовка и повышение квалификации. Профилю этих подразделений должна соответствовать специализация подразделений территориальных прокуратуры, а также судей областных, Минского городского и Верховного судов по рассмотрению уголовных дел о терроризме и иных особо опасных насильственных преступлениях.

Тем самым в системе правоохранительных органов будут созданы специальные и, видимо, особо надежные для власти подразделения, которые развернут широкомасштабную борьбу с "террористами" и иже с ними. Совсем как в 30-е годы: спецоперативные работники, спецследователи, спецпрокуроры, спецадвокаты и спецсуды. Но все это противоречит Конституции Республики Беларусь, которая запрещает образование чрезвычайных (то есть не предусмотренных законом) судов. Не имеет это ничего общего с международными стандартами в области судопроизводства.

В прямое нарушение с правами человека вступает пункт декрета о применении к лицам, причастным (но ведь это сначала нужно доказать! — **М.П.**) к "терроризму" или иным особо опасным насильственным преступлениям, "превентивного задержания" на срок до 30 суток.

Как известно, такая субъективная в своей основе мера пресечения ранее допускалась по указу президента Российской Федерации в рамках борьбы с организованной преступностью и коррупцией. Получив негативную оценку со стороны демократической общественности и европейских структур, она была сравнительно быстро отменена. У нас же, в Беларуси, это негодное с правовой точки зрения средство берется на вооружение. Понять это трудно. "Превентивное задержание" фактически отменяет гарантии защиты прав личности в уголовном судопроизводстве. Пользуясь этим правом, работники милиции, КГБ и прокуратуры могут схватить любого "нужного" им человечка и держать его под стражей, не предъявляя ему никаких обвинений. Уж очень это напоминает средневековье, когда жизнь человека ни во что не ставилась и его можно было по высочайшему указанию пытать в застенке как кусок мяса и костей.

В явное противоречие с нормами международного права вступают положения декрета о возможности проведения экспертизы до возбуждения уголовного дела, результаты которой рассматриваются в качестве доказательств по уголовному делу (пункт 1.6), об обязательном применении к подозреваемым и обвиняемым в совершении терроризма или иных особо опасных насильственных преступлений в качестве меры пресечения заключения под стражу (пункт 1.7).

Весьма показательно, что декрет президента не объявляется временным (хотя по новой редакции Конституции он не может быть иным. — **М.П.**). Администрации президента в двухнедельный срок (?!) по согласованию с Государственным секретариатом Совета безопасности (?!) предлагается разработать и представить президенту проект закона о внесении изменений и дополнений в Уголовный и Уголовно-процессуальный кодексы РБ, вытекающих из положений декрета.

Получается, что в Беларуси законы приводятся в соответствие с подзаконными актами, каковыми, без сомнения, являются декреты и указы президента. Это означает, что на практике декрет президента стал выше закона, а исполнительная власть откровенно вышла из-под контроля власти законодательной (последняя в Беларуси существует чисто номинально, в виде бутафорского парламента. — **М.П.**). Теперь с помощью декретов президент Беларуси намерен управлять белорусским обществом, навязывая ему свою единоличную волю. Впечатление от этого у европейского сообщества должно быть не самым лучшим. Там как-то привыкли к верховенству закона в делах государственных и разделению властей, с тем чтобы не было среди них первой власти и всех остальных.

По сути дела, принятие декрета о "терроризме" означает переход к открытой борьбе с инакомыслием. Отныне каждый гражданин, имеющий свое мнение и отстаивающий свои убеждения, рискует стать "террористом" (в 30-е годы таких людей называли "врагами народа"). Можно предположить, что репрессивный механизм в скором времени будет запущен на полную катушку, поскольку число недовольных властью в Беларуси нарастает, как снежный ком, катящийся с горы. Вот тогда понадобится и превентивное задержание в отношении так называемых террористов (а на деле — наиболее активных противников режима), и специальные бригады следователей, и спецсуды.

Следующим шагом в очищении белорусского общества от "террористов", возможно, станет образование концентрационных лагерей. И сейчас Беларусь занимает одно из первых мест в мире по числу осужденных (565 человек на 100 тысяч населения. — **М.П.**). После применения декрета №21 исправительно-трудовым лагерем станет вся страна: кто-то будет править, кто-то будет доносить, кто-то будет садить и охранять, а многим придется "отдохнуть" десяток лет от мирской суеты.

Так что же мы строим: демократическое правовое государство или "зону", обнесенную со всех сторон колючей проволокой? Во всяком случае, ясно одно: Беларусь действительно не идет за цивилизованным миром. Власти предержащие не только не дают ей развиваться, но и упорно тянут в прошлое, в 30-е годы, где сталинские опричники каленым железом выводили "контрреволюционную" ересь. И сейчас в руки правоохранительных органов декрет президента вложил каленое железо.

Что же будет?

Навіны з Віцебшчыны

На замежны рынак працы лепш трапляць не з чорнага ходу

Дэфіцыт рабочых месц на ўнутраным рынку і мізэрная зарплата вымушаюць некаторых жыхароў рэспублікі шукаць работу ў іншых краінах. Знаходзіцца і нямала жадаючых дапамагчы ў гэтым. Аднак часта многія становяцца ахвярамі падману. У прыватнасці, у такой сітуацыі аказаліся маладыя віцяблянкі, якія спакусіліся на заманлівыя прапановы шэрага фірм і некаторых асоб атрымаць за мяжой высокааплатную работу. Аднак на справе "шырокі выбар прафесій" абяцаў адзіную перспектыву — заняткі прастытуцыяй.

Даведаўшыся аб такіх фактах, аддзел Дзяржаўнай міграцыйнай службы народанасельніцтва, дэмаграфіі і сацыяльнага прагнозу камітэта па працы Віцебскага аблвыканкама прыняў шэраг мер. Ён звярнуў таксама ўвагу абласнога камітэта пасрэдніцтва і інвестыцый на выпадкі грубага парушэння некаторымі кампаніямі Пастановы ўрада "Аб мерах па рэгуляванню знешняй працоўнай міграцыі".

Высветлілася і нямала іншых парушэнняў, звязаных з вярбоўкай рабочай сілы. Працэдура падману была даволі простая. Пад яркім загалоўкам "Работа за мяжой" на тэлеэкране або на дошцы аб'яў указваліся нумары кантактных тэлефонаў. У выпадку, калі гэта не было проста сродкам выдурвання грошай за "паслугу", і работу мігранты сапраўды атрымлівалі, змежныя фірмы імкнуліся атрымаць аднабаковую выгаду ад такіх здзелак. Кантракты паміж наймальнікамі і мігрантамі не заключаліся зусім, або яны не адпавядалі міжнародным патрабаванням. У выніку праца нашых рабочых аплачвалася значна ніжэй, чым іншых, яны былі пазбаўлены элементарных правоў.

Да таго ж, у краінах Заходняй Еўропы, куды накіроўваюцца мігранты, прымаюцца даволі жорсткія абмежавальныя меры. Напрыклад, работадавец ФРГ, які прыняў нелегальнага работніка, штрафуецца ў памеры 100 тысяч марак, а работнік — на тысячу марак з наступнай дэпартацыяй з краіны.

Выхад з існуючага становішча начальнік аддзела Дзяржаўнай міграцыйнай службы народанасельніцтва, дэмаграфіі і сацыяльнага прагнозу камітэта па працы Віцебскага аблвыканкама Галіна Шайко бачыць не толькі ў спыненні незаконных спроб вярбоўкі рабочай сілы, але і ў распрацоўцы сістэмы мер падтрымкі дзяржаўных і камерцыйных структур, якія імкнуцца замацавацца на сусветным рынку рабочай сілы. Робячы гэта самастойна, на свой страх і рызыку, яны нярэдка падвяргаюцца націску з боку замежных партнёраў. Выправіць сітуацыю дапаможа заключэнне адпаведных пагадненняў Рэспублікі Беларусь з заходнееўрапейскімі і іншымі дзяржавамі, як гэта ўжо зроблена з краінамі СНД і Балтыі.

